Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(55), Ч1, 2009

*УДК 2–42*

# Да праблемы супастаўлення рэлігійных маральных сістэм

В. А. Адзіночанка

Пры супастаўленні маральных сістэм розных рэлігій мы ставім перад самой дзве ўзаемазвязаныя мэты: па-першае, асэнсаваць спецыфіку рэлігійнай маралі і рэлігіі ў цэлым і, па-другое, прааналізаваць праблему ўзаемадзеяння розных рэлігій, рэлігійнага і свецкага тыпаў светаўспрымання, якія ўтрымліваюць розныя спосабы чалавечых паводзін (мараль ад лац. *mores – звычаі, паводзіны*). Матэрыялам для нашых разважанняў будуць служыць перш за ўсё сусветныя рэлігіі (будызм, хрысціянства, іслам), паколькі менавіта на іх прыкладзе можна найбольш дакладна паказаць, што такое рэлігія, якое месца ў ёй займае мараль, чым абумоўлена спецыфіка апошняй.

Зараз існуе звыш чатырохсот азначэнняў рэлігіі. У межах нашага даследавання мы будзем разглядаць яе як грамадска аформлены тып светаўспрымання і светаадчування, а таксама як адпаведныя паводзіны і спецыфічныя дзеянні, што грунтуюцца на веры ў звышнатуральнае. Калі казаць каротка, рэлігія – гэта вера ў звышнатуральнае і паводзіны ў адпаведнасці з гэтай верай.

Звышнатуральнае – гэта тое, што знаходзіцца па-за межамі прыроды і не можа быць успрынята сродкамі прыродазнаўчых навук, а таксама ў межах штодзённага вопыту.

Што тычыцца прыродазнаўчых навук, дык тут адпавочныя схемы разважанняў наконт звышнатуральнага. Як сведчыць сама іх назва, гэтыя навукі займаюцца даследаваннем прыроды (лац. *natura*) і не разглядаюць тое, што выходзіць за яе межы. Таму звышнатуральнае ў любой яго мадыфікацыі не можа быць аб'ектам іх даследавання. Да нядаўняга часу ў нашым грамадстве рэлігія і навука разглядаліся як варожыя формы свядомасці. Тлумачылася гэта перш за ўсё ідэалагічнымі прычынамі: рэлігія разглядалася не толькі як "опіум народа", але і як "форма антыкамуністычнай ідэалогіі", таму яе імкнуліся як мага больш жорстка крытыкаваць. Зараз разам са знікненнем напружанасці ідэалагічных баталій трактоўка суаднясення рэлігіі і навукі зрабілася больш спакойнай, яны проста разглядаюцца як розныя формы культуры. Акцэнт пры гэтым робіцца менавіта на іх адрозненні, а не на варожасці.

Што тычыцца штодзённага вопыту, дык тут, на наш погляд, патрэбна ўдакладненне. Справа ў тым, што той штодзённы вопыт, які мы маем і які здаецца нам адпавочным, – гэта вынік жыцця ў секулярызаваным грамадстве, аддзеленым ад звышнатуральнага. Секулярызацыя (ад познелац. *saecularis – мірскі, свецкі*) – працэс раздзялення рэлігійнага і свецкага ў грамадскім жыцці. Але сама секулярызацыя – параджэнне еўрапейскай хрысціянскай культуры. У хрысціянстве ёсць дакладнае разуменне адрознення сакральнага (лац. *sacrum*) ад штодзённага (лац. *profanum*). У язычніцтве ж (ад старажытнаслав. *языци – народы*) – рэлігіі, у якой звышнатуральныя якасці прыпісваюцца сілам прыроды, такога адрознення няма, тут штодзённае і звышнатуральнае зліты разам, звышнатуральныя сілы – частка штодзённага жыцця чалавека. Напрыклад, сядзіба беларускага селяніна была населена звышнатуральнымі істотамі: у хаце жыў хатнік, у лазні – лазнік, у хлеве – хлеўнік і г. д. І гэтыя істоты не ўспрымаліся як нешта незямное, а менавіта як частка жыццёвага асяроддзя. Як вядома, язычніцтва з'яўляецца рэлігіяй, якая параджаецца любым штодзённым жыццём, у тым ліку і жыццём сучаснага студэнта (гэта такія з'явы, як вера ў сурокі, біяпалі, фэн-шуй, астралогію, замовы на экзамен і г. д.). І тут існуе адпаведная мараль, якая накіравана на прыстасаванне да існуючага асяроддзя, да тых з'яў, ад якіх чалавек залежыць і якія могуць трактавацца ім як звышнатуральныя. І тады для ўзаемадзеяння з імі выкарыстоўваецца магія. Такім чынам, у язычніцтве (як традыцыйным, так і сучасным) звышнатуральнае ўспрымаецца як нешта

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

блізкае, тое, што з'яўляецца часткай штодзённага вопыту, не выходзіць за яго межы, можа быць апісана ў яго паняццях, на што можна ўздзейнічаць. Крыніца маральных паводзін тут – імкненне ўладкаваць свае ўзаемаадносіны з наваколлем, у тым ліку і звышнатуральным, каб пазбегнуць адмоўнай рэакцыі з яго боку. Напрыклад, беларускія сяляне верылі, што хатнік дапамагае ў гаспадарцы (сочыць, каб не было пажару, каб ежа не прыгарала і г. д.), але толькі ў тым выпадку, калі ў сямейным жыцці ёсць згода: дзеці слухаюцца бацькоў, а жонка – мужа. Калі ж гэтага не было, ён злаваўся і рабіў розную дробную шкоду: перакульваў гаршкі з ежай, выў у комін, хаваў рэчы. Асабліва хатнік не любіў сварлівых баб, і калі такая ёсць у хаце – ноччу навальваўся ёй на грудзі і душыў. І зараз шмат хто, асабліва жанчыны, неабходнасць маральных паводзін тлумачаць тым, што "тое зло, якое ты зробіш іншым, абавязкова да цябе вернецца". Такім чынам, неабходнасць маральных паводзін у язычніцтве выводзіцца з патрэб штодзённага жыцця.

Тыя ж рэлігіі, маральныя сістэмы якіх мы будзем супастаўляць, – гэта рэлігіі адкрыцця. Сцвярджаецца, што іх асноўныя палажэнні – вынік звышнатуральнага вопыту заснавальнікаў: Буды, Хрыста, Магамета. І тут, па-першае, прысутнічае дакладнае раздзяленне натуральнага і звышнатуральнага, і па-другое, звышнатуральнае адэкватна не апісваецца праз мову штодзённага жыцця і не ўяўляе сабой яго часткі. Для веруючых яно з'яўляецца святым – тым, што мае для іх найбольшую каштоўнасць і на што яны абапіраюцца ў сваіх паводзінах.

Падкрэслім, што звышнатуральнае ў рэлігіях – гэта тое, што задае структуру рэчаіснасці. Бог у хрысціянстве і Алах у ісламе не толькі ўстанавілі для людзей правілы паводзін, але і стварылі свет. Тыя маральныя нормы, якія яны далі людзям, прама карэлююцца са структурай гэтага свету. Такім чынам, у рэлігіі аксіялогія (вучэнне пра каштоўнасці, у тым ліку і маральныя) грунтуецца на анталогіі (вучэнні аб пабудове свету).

Менавіта звышнатуральнае – гэта тое, што вызначае спецыфіку рэлігійнай маралі, бо праз яго задаецца структура рэчаіснасці, у якой веруючы чалавек жыве і дзейнічае.

Рэлігійная мараль – гэта сукупнасць норм паводзін, якімі карыстаюцца прыхільнікі той ці іншай рэлігіі ў сваім штодзённым жыцці. Для веруючых яны маюць звышнатуральнае паходжанне, лічыцца, што гэтыя нормы не прыдуманы людзьмі, а дадзены Богам. Кожная рэлігія мае сваё разуменне звышнатуральнага, і таму задаюцца розныя анталогіі. Больш таго, сам тэрмін *звышнатуральнае* мае ўмоўны характар і ўводзіцца для таго, каб абазначыць тое спецыфічнае, што ёсць у рэлігіях. Але сама сутнасць звышнатуральнага ў розных рэлігіях розная (падкрэслім, што гаворка ідзе не пра мадыфікацыі аднаго і таго ж, а пра прынцыпова розныя рэчы). Звышнатуральнае ў хрысціянстве – гэта зусім іншае, чым звышнатуральнае ў будызме.

Асноўнае палажэнне, якое мы імкнёмся падкрэсліць на дадзеным этапе разважанняў, можна спрошчана сфармуляваць наступным чынам: кожная рэлігія – гэта канкрэтная сістэма поглядаў і дзеянняў, якія грунтуюцца на спецыфічнай ідэі звышнатуральнага. Рэлігіі не сумяшчальныя паміж сабой, палажэнні адной рэлігіі немагчыма адэкватна праінтэрпрэтаваць з пункту погляду іншай, рэлігійныя маральныя нормы і абумоўленыя імі паводзіны грунтуюцца на прынцыпова розных светапоглядных прынцыпах, і гэтым абумоўлена спецыфіка паводзін прадстаўнікоў розных рэлігій.

Разгледзім гэта на канкрэтных прыкладах. Узорам рэлігіі для нас з'яўляецца хрысціянства. Вядома, што рэлігіі наогул няма, ёсць канкрэтныя рэлігіі. Больш таго, само паняцце *рэлігія* сфарміравалася ў межах еўрапейскай культуры і ў сучасным сваім значэнні тычыцца перш за ўсё хрысціянства. Тое, што мы называем рэлігіяй, у Кітаі называецца "цзяо", што значыць "навука", у Індыі "дхарма" – "вучэнне", у арабаў "дзін" – "абавязак" і г. д.

Сам тэрмін *рэлігія* даследчыкі звычайна супастаўляюць з лацінскім дзеясловам *religare* – "звязваць, яднаць". Ад яго паходзіць назоўнік *religio* – "святыня, набожнасць". Старажытныя рымляне абазначалі гэтым словам усё тое, што было звязана з ушанаваннем багоў. Найбольш распаўсюджанае ў хрысціянстве тлумачэнне этымалогіі слова *рэлігія* даў вядомы тэолаг V стагоддзя Аўрэлій Аўгусцін. Ён разглядаў яе як "узнаўленне страчанай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сувязі". Трэба падкрэсліць спецыфічна хрысціянскі характар гэтага тлумачэння: лічыцца, што калісьці існавала непасрэдная сувязь чалавека з Богам, потым з-за грахоў людзей яна была разарвана, і ў рэлігійным акце чалавек спрабуе ўзнавіць гэтую сувязь. Але, напрыклад, у будызме такога паняцця страчанай сувязі няма, больш таго, у некаторых яго накірунках нават адмаўляецца рэальнае існаванне звышнатуральных істот, і таму няма з кім узнаўляць сувязь. Таму спачатку рэлігіяй еўрапейцы называлі толькі хрысціянства, а для абазначэння іншых тыпаў вераванняў ужываўся тэрмін *язычніцтва*.

У далейшым паняцце *рэлігія* было ў палемічных мэтах пашырана і на нехрысціянскія вераванні, іх тлумачылі як "несапраўдныя" рэлігіі і гэтым адрознівалі ад хрысціянства. Толькі ў XIX стагоддзі ў сувязі з геаграфічнымі адкрыццямі і знаёмствам еўрапейцаў з іншымі культурамі данае паняцце стала ўжывацца ў яго сучасным сэнсе для абазначэння адной з галін духоўнага жыцця разам з мараллю, навукай, філасофіяй, мастацтвам і г. д. У гэты ж час пачынае разгортвацца палеміка вакол пытання "Што такое рэлігія?", якая працягваецца па сённяшні дзень, аб чым сведчыць разнастайнасць азначэнняў. Аднак у большасці з іх можна вылучыць наступныя агульныя характарыстыкі рэлігіі: па-першае, яна характарызуецца як адна з форм чалавечай дзейнасці, і па-другое, спецыфіка апошняй бачыцца ў тым, што яна грунтуецца на веры ў нейкія надпрыродныя, вышэйшыя сілы і з'яўляецца яе вынікам.

Адзначым, што ў розных рэлігійных сістэмах мараль займае рознае месца. Напрыклад, у антычнай рэлігіі асноўная ўвага надавалася культу. Галоўнае, каб чалавек прымаў удзел у агульнагарадскіх ахвярапрынашэннях і адкрыта не крытыкаваў афіцыйна прынятых багоў, яго паводзіны не былі аб'ектам рэлігійнага разгляду. У сусветных жа рэлігіях немагчыма казаць аб тым, што чалавек з'яўляецца іх прыхільнікам, калі ён не выконвае ўстаноўленыя маральныя нормы.

Але ў кожнай з гэтых рэлігій па-рознаму разумеецца, што такое мараль і адкуль яе паходжанне. Напрыклад, хрысціянства выходзіць з таго, што ўвесь свет створаны Богам, прычым, гэта падкрэсліваецца ў Біблii, створаны дасканала: "І ўбачыў Бог усё, што Ён стварыў, і гэта добра вельмі" (Быц. 1, 31).

Такім чынам, згодна з хрысціянствам, Бог стварыў свет і чалавека. Тыя маральныя нормы, што Ён даў, – гэта правілы паводзін, якія адпавядаюць характару рэчаіснасці, і менавіта гэтым абумоўлена неабходнасць іх выканання. Фундаментам этыкі тут з'яўляецца анталогія, адлюстраванне структуры свету.

Бог хрысціянства – гэта Бог, які любіць. Маральныя нормы ўстаноўлены Ім для таго, каб зрабіць чалавека свабодным і шчаслівым. Маральнасць чалавека – гэта адказ на любоў Бога. Норма – гэта не абмежаванне, як вельмі часта лічыцца. Знакамітыя Дзесяць запаведзяў пачынаюцца так: "Я Гасподзь, Бог твой, Які вывеў цябе з зямлі Егіпецкай, з дома рабства" (Вых. 20.2). Маральныя нормы ("не забі", "не блудзі", "не крадзі" і г. д.) – гэта правілы паводзін, якіх чалавек павінен прытрымлівацца, каб пазбавіцца ад рабства грахоў.

У хрысціянстве ж гэтыя нормы яшчэ больш паглыбляюцца:"Не думайце, што я прыйшоў парушыць закон або пракокаў: не парушыць прыйшоў я, а здзейсніць" (Мц. 5, 17). Але запаведзі, якія даў Хрыстос у Нагорным казанні, маюць парадаксальны характар (грэч. *para – насуперак*, *doxa – меркаванне* – тое, што супярэчыць штодзённаму вопыту і прынятым уяўленням). У якасці прыкладу прывядзём наступныя ўрыўкі тэкстаў, у якіх адбываецца радыкальнае пераасэнсаванне нормаў Старога Запавету: "Вы чулі, што сказана: "Вока за вока і зуб за зуб". А Я кажу вам не працівіцца злому. Калі хто цябе ўдарыць па правай шчацэ тваёй, падстаў яму і другую" (Мц. 5, 38–39) і "Вы чулі, што сказана: "Любі блізкага твайго і ненавідзь ворага твайго". А я кажу вам: любіце ворагаў вашых, дабраслаўляйце кляцьбітоў вашых, рабіце дабро ненавіснікам вашым і маліцеся за крыўдзіцеляў вашых і за ганіцеляў вашых; каб сталіся вы сынамі Айца вашага, які ёсць у нябёсах; бо Ён загадвае сонцу Свайму ўзыходзіць над ліхімі і добрымі і пасылае дождж на праведных і няправедных. Бо калі вы будзеце любіць тых, што любяць вас, якая вам узнагарода? Ці ж не тое самае робяць і мытнікі? Калі вы вітаеце братоў вашых, што асаблівага робіце? Ці ж не гэтак тое самае робяць і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

язычнікі? Дык вось, будзьце дасканалымі, як дасканалы Айцец ваш Нябесны (Мц. 5, 43–48).

Хрысціянства ўспрымаецца ў нашай культуры як узор рэлігіі, і мы ўпэўнены, што ягоныя нормы з'яўляюцца агульначалавечымі. Каб паказаць, што гэта не так, разгледзім анталогію і маральную сістэму будызму, іншай, вельмі непадобнай на хрысціянства, рэлігіі.

Тут няма распрацаванай касмалогіі (вучэння аб пабудове свету). Сваёй асноўнай задачай Буда лічыў не тлумачэнне свету, а ўказанне людзям шляхоў выратавання. Ён параўноўваў гэта з наступнай сітуацыяй: калі чалавек будзе паранены стралой і пачне высвятляць, хто ў яго стрэліў, колькі яму год, мужчына гэта ці жанчына, дык ён раней памрэ, чым высветліць усё гэта. Таму не трэба задаваць такія пытанні, а хутчэй выцягваць стралу і перавязваць рану. Так і ў жыцці: чалавек задумваецца над метафізічнымі пытаннямі накшталт такіх, адкуль узнік свет, з чаго ён складаецца, куды ідзе. Ён не знаходзіць адказаў на іх і памірае незадаволеным. Таму, калі Будзе задавалі пытанні пра будову свету, ён проста маўчаў. Гэта называецца " вялікім маўчаннем Буды". Але сам будызм з'явіўся лагічным працягам і своеасаблівым адмаўленнем папярэдніх рэлігій: ведызму і брахманізму. І анталагічныя ўяўленні былі ім узяты менавіта адтуль. Лічыцца, што наш свет – гэта сукупнасць дхарм (ад арыйск. *dhar – сцвярджаць, падтрымліваць, абараняць*) – найдрабнейшых кампанентаў, з якіх складаецца свет.

Само слова "дхарма" мае шмат значэнняў. Згодна з адным з іх, дхармы – гэта элементы: зямля, вада, агонь, паветра; сіла волі, сіла розуму, сумленне, невуцтва, слава, прыгажосць, багацце, сексуальнасць, сон, голад, хвароба, заспакаенне, сталасць, смерць. Рэчаіснасць – паток дхарм, якія безупынна рухаюцца і, аб'ядноўваючыся розным чынам, ствараюць рэчы і свет у цэлым. Прынцып, у адпаведнасці з якім з патоку дхарм фарміруецца жыццё чалавека, называецца кармай. Само гэта слова перакладаецца як "дзеянні", "учынкі". Карма – гэта сукупнасць учынкаў, якія чалавек здзейсніў за сваё жыццё і якія вызначаюць яго будучае існаванне. Ад папярэдняга яму брахманізму будызм засвоіў уяўленне пра сансару (у перакладзе з санскрыту – *кругазварот, пераход праз розныя станы, блуканне*) – кола перараджэнняў. Лічыцца, што пасля смерці чалавек не знікае, а перараджаецца ў іншую істоту, у адпаведнасці са сваёй кармай. Калі ў яго добрая карма (пераважаюць добрыя учынкі), яго будучае жыццё будзе добрым, ён народзіцца ў выглядзе жраца або князя, калі нейтральная (колькасць добрых і дрэнных учынкаў роўная) – жыццё будзе такім жа, калі дрэнная (пераважаюць благія ўчынкі) – народзіцца чалавекам з нешчаслівым лёсам або жывёлай.

Менавіта працэсам безупыннага перараджэння (сансарай) абумоўлены пакуты чалавека, пад якімі ў будызме разумеецца неспакой, хваляванне, мітусня. Буда не казаў аб структуры свету, але асноўны яго тэзіс той, што чалавек у гэтым свеце – істота, якая ўвесь час пакутуе.

Этыка будызму грунтуецца на чатырох высакародных ісцінах, якія адкрыліся Будзе ў выніку яго духоўных пошукаў.

Першая ісціна – усё жыццё ёсць зло і пакуты. Нараджэнне – гэта пакуты, смерць – гэта пакуты, хвароба – гэта пакуты, неспакой, няшчасце, боль, расчараванне і адчай – гэта пакуты, немагчымасць атрымаць жаданае – гэта пакуты і г. д.

Другая ісціна – прычынай пакут з'яўляюцца жаданні. З засвоенага ад брахманізму вучэння пра сансару будызм зрабіў прынцыпова іншую этычную выснову. У брахманізме яна гучыць прыкладна так: калі ў чалавека цяжкае жыццё – гэта пакаранне за тое зло, якое ён зрабіў у мінулым. Трэба паводзіць сябе добра – і будучае жыццё стане лепшым. Для будызму такая логіка непрымальная, бо ў ім любое жыццё лічыцца злом і пакутамі. Прычынай жа пакут з'яўляюцца жаданні, як добрыя, так і дрэнныя, бо гэта менавіта яны прыводзяць да учынкаў і новых перараджэнняў.

Трэцяя ісціна – каб пазбавіцца ад пакут, трэба пазбавіцца ад жаданняў. Сукупнасць добрых і дрэнных жаданняў чалавека з'яўляецца падставай для яго далейшых перараджэнняў. Калі знікаюць жаданні, працэс перараджэнняў спыняецца.

Чацвёртая ісціна – каб пазбавіцца ад жаданняў, трэба ісці па "высакароднаму

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

васьмярычнаму шляху", які ўказаў Буда. Называецца ён так таму, што складаецца з васьмі наступных крокаў:

1. Праведныя погляды, гэта значыць, погляды, заснаваныя на "высакародных ісцінах".

2. Праведнае імкненне – сяброўскае стаўленне да ўсяго жывога, спачуванне да ўсіх істот, якія пакутуюць, бясконцая радасць ад поспехаў іншых і духоўная ўраўнаважанасць ва ўсіх абставінах.

3. Праведная мова – добразычлівая, шчырая мова, пазбаўленая грубасці, ілжы, нагавораў.

4. Праведныя паводзіны – паводзіны, падпарадкаваныя наступным пяці прынцыпам: а) захаванне вернасці ў шлюбе; б) адмаўленне ад забойства ўсякай жывой істоты; в) адмаўленне ад крадзяжу; г) адмаўленне ад хлусні; в) адмаўленне ад ужывання наркатычных сродкаў, у тым ліку алкаголю.

5. Праведнае жыццё – перад усім, гэта азначае жыццё на сумленна здабытыя сродкі. Спосаб зарабляць сабе на жыццё не павінен прыносіць шкоды іншым людзям.

6. Праведнае намаганне – пераадоленне ўсяго, што прывязвае да сябе свядомасць.

7. Праведная ўвага – пастаянная сканцэнтраванасць свядомасці на тым, чаго ўдалося ўжо дасягнуць на шляху пазбаўлення ад пэўных схільнасцей.

8. Праведная медытацыя – стан поўнай адлучанасці ад свету і пазбаўлення ад якіх-небудзь жаданняў.

Канчатковай мэтай васьмярычнага шляху з'яўляецца дасягненне нірваны. Згодна з будыйскай традыцыяй, рацыянальна растлумачыць, што такое нірвана, немагчыма. Звычайна пад ёй разумеецца адсутнасць "павуціння жаданняў", якое звязвае адно жыццё з другім. Само слова *нірвана* перакладаецца з санскрыту як "затуханне", "згасанне". Падобна таму, як полымя згасае, калі заканчваецца паліва, спыняецца кола перараджэнняў, калі знікаюць жаданні. "Мудрыя, – вучыў Буда, – затухаюць, як лампады". Такім чынам, нірвана – гэта ўнутраны стан чалавека, які характарызуецца поўнай адсутнасцю жаданняў, свабодай, раўнавагай, адлучанасцю ад праблем жыцця, абсалютным спакоем.

У свяшчэнным тэксце будыстаў "Трыпітацы" пішацца: "Нірвана – гэта месца, дзе няма зямлі, вады, агню і паветра; гэта не бясконцая прастора і не месца, дзе нічога няма; не мяжа паміж адрозным і неадрозным; не гэты свет і не іншы; яна там, дзе няма ні сонца, ні месяца. Я не магу сказаць, што яна прыходзіць і сыходзіць, або стаіць на месцы, або затухае, або пачынаецца. У яе няма асновы, няма працягу і няма спынення. Гэта канец пакут".

Сэнс нірваны ў тым, што яна ставіць чалавека па той бок неабходнасці, і таму яна тоесная свабодзе. Аднак гэта негатыўная свабода, свабода ад жаданняў, пачуццяў, прыхільнасцей. Этыка будызму мае песімістычны характар: усё жыццё – гэта зло і пакуты, і, каб пазбавіцца ад пакут, трэба фактычна пазбавіцца ад жыцця. Але не шляхам самазабойства, бо гэта толькі пагоршыць карму і прывядзе да новага больш дрэннага існавання, а шляхам адмаўлення ад усяго, што прывязвае да гэтага свету, яго хваляванняў, радасцей і пакут, каб дасягнуць абсалютнага спакою ў нірване.

Мараль будызму – гэта прынцыпова іншае, чым тое, што разумем пад мараллю мы. Мараль для нас – гэта правілы паводзінаў; сэнс маральнай сістэмы – у арганізацыі паводзін у адпаведнасці з тымі ці іншымі нормамі. Чалавек нясе адказнасць за свае ўчынкі, і яны маюць для яго вынік. Згодна з хрысціянствам, калі ўчынкі чалавека будуць добрымі, ён трапіць у рай, калі злымі – у пекла. Але ў будызме і добрыя, і благія ўчынкі – гэта частка сансары, і яны прыводзяць да добрых або дрэнных перараджэнняў, будысты ж імкнуцца выйсці з гэтага кола і дасягнуць нірваны, а гэта значыць, адмовіцца ад актыўных учынкаў. Такім чынам, мэта маралі будызму – адмаўленне ад актыўнасці і дасягненне спакою. З нашага пункту погляду, гэтая мэта мае не маральны, а хутчэй псіхатэрапеўтычны характар.

Іслам не з'яўляецца настолькі адрозным ад хрысціянства, як будызм, і ягоныя нормы не настолькі нам нязвыклыя. Ён належыць да ліку так званых аўрамічных рэлігій, куды адносяцца таксама іудаізм і хрысціянства. Гэта тыя рэлігіі, пачатак якіх ідзе ад біблейскага Аўраама. Таму шмат якія іх палажэнні супадаюць. У свяшчэннай кнізе ісламу Каране вельмі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

шмат запазычанняў з Бібліі. Мусульмане гэта прызнаюць і тлумачаць наступным чынам. Алах адкрываўся людзям некалькі разоў. Спачатку ён не цалкам адкрыўся яўрэям – гэта Стары Запавет. Потым ён не цалкам адкрыўся хрысціянам – гэта Новы Запавет. І ўжо потым ён цалкам адкрыўся мусульманам – гэта Каран. Такім чынам, згодна з ісламам, Каран – гэта найбольш поўнае адкрыццё Алаха. Вучоныя ж тлумачаць запазычанні тым, што заснавальнік ісламу Мухамед быў купцом, наведваў тыя мясціны, дзе было распаўсюджана хрысціянства (яно ўзнікла на шэсць стагоддзяў раней, чым іслам), і потым перанёс тыя біблейскія сюжэты, якія пачуў, у Каран.

Але мараль у ісламе – гэта прынцыпова іншае, чым тое, што разумеем над мараллю мы, бо іслам – гэта перш за ўсё рэлігія закону.

Само слова *іслам* перакладаецца як "пакора", слова *мусульмане* – як "пакорныя". Немусульманамі называюцца "няверныя" ("кафір"), і гэтае слова паходзіць не ад слова *вера*, а ад слова *вернасць* – гэта тыя, якія не выконваць запаведзі Алаха, няверныя яму.

У ісламе няма раздзялення на свецкую і рэлігійную сферу, бо, як пішуць самі мусульмане, ён патрабуе ўсяго чалавека. Няма такой увагі ўнутранаму свету чалавека, якая надаецца ў хрысціянстве. Акцэнт перш за ўсё робіцца не на погляды чалавека, а на яго паводзіны. Для ісламу дактрыны бессэнсоўныя, калі іх нельга перавесці ў сферу практычнага жыцця. Гэта "артапрактычная" рэлігія, яна арыентавана на правільныя дзеянні (ад грэц. *orthos – правільны* і *praxis – дзеянне*). У ісламе распрацоўваецца пераважна не дагматыка, а маральная і практычная праблематыка.

Увасабленнем спецыфікі стылю ісламскага мыслення і жыцця, а таксама асновай самога ісламу з'яўляецца шарыят – сукупнасць прынцыпаў паводзін мусульманіна (спачатку слова *шарыят* азначала "дарога да вадапою", а потым было пераасэнсавана як "прамы, правільны шлях запаведзяў Алаха"). У яго ўваходзяць не толькі прававыя, але і маральныя нормы і культавыя прадпісанні, якія ахопліваюць усё жыццё мусульманіна. Трэба адзначыць, што правілам шарыяту мусульмане надаюць значна большую ўвагу, чым чыста дагматычным палажэнням, бо іслам больш дэталёва распрацоўвае праблемы штодзённага жыцця, чым пытанні аб сутнасці Алаха.

Шарыят і па сённяшні дзень застаецца галоўнай крыніцай заканадаўства ў большасці мусульманскіх краін. У ім рэгулюецца рэлігійная дагматыка, правілы паводзін чалавека і сацыяльныя ўзаемаадносіны. Такім чынам, у шарыяце аб'яднаны рэлігійны, прававы і этычны аспекты. Маральныя ўчынкі рэгулююцца правам, а прававыя паводзіны разумеюцца перад усім як рэлігійна-этычныя.

Мараль у ісламе разглядаецца як праява вернасці Алаху, выкананне яго законаў, а не як вынік унутранага выбару чалавека. Галоўнае тут – паводзіны ў адпаведнасці з шарыятам. Накірункі ў ісламе – гэта прававыя школы, кожная з якіх мае свой звод нормаў паводзін.

Іслам – гэта рэлігія мінімальнага патрабавання. Таму яна вельмі прыдатная для рэгуляцыі штодзённага жыцця. Напрыклад, тут дэтальна фармалізаваны адносіны мужа і жонкі. Кожны з іх ведае, што яму рабіць. Мужчына можа мець да чатырох жонак, але ён павінен аднолькава ставіцца да кожнай з іх. Пры заключэнні мусульманскага шлюбу прынята заключаць кантракт, і жанчына можа ўнесці ў яго пункт, што яна будзе адзінай жонкай. Нават калі такога пункту няма, муж, калі ён хоча ўзяць другую жонку, абавязаны атрымаць на гэта згоду першай, калі трэцюю – дзвюх папярэдніх і г. д. Калі жанчына выходзіць замуж, яна мае права не працаваць, калі ж працуе, грошы, якія яна зарабіла, – гэта толькі яе грошы. Дакладна распісана, што рабіць мужу, калі жонка яго не слухаецца (трэба адзначыць, што ўжываць фізічную сілу ён можа толькі ў выключных выпадках, калі жонка ўпартая ў сваім непадпарадкаванні).

У ісламе ёсць патрабаванні наконт адзення: прадпісваецца апранацца сціпла, мужчынам забаронена шаўковае адзенне і ўпрыгожанні, за выключэннем срэбранага абручальнага пярсцёнка; жанчыны могуць насіць срэбраныя і залатыя ўпрыгожанні, святочнае адзенне, але толькі ў сябе дома, на людзях яны павінны закрываць цела і валасы.

Ёсць забарона на ежу. Нельга ўжываць мярцвячыну, кроў, мяса драпежнікаў,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

грызуноў, насякомых (апрача саранчы), жывёлы, забітай не чалавекам, прадуктаў, якія прынесены ў ахвяру ідалам. Што тычыцца свінні, то яна ў ісламе лічыцца нячыстай жывёлай. і яе мяса мусульманіну есці нельга. Але, калі няма іншай ежы, мусульманін, каб захаваць сваё жыццё і здароўе, можа ўжываць свініну. Жывёла, якую можна есці, павінна быць забіта па асаблівым рытуале (як і ў абрадах іудзеяў, трэба, каб з яе была цалкам спушчана кроў). У мусульман ёсць спецыяльныя мясныя лаўкі, дзе можна купляць мяса жывёл, забітых па іудзейскім рытуале.

У ісламе Алах – гэта перш за ўсё міласэрны суддзя. Маральнасць чалавека – гэта выкананне тых нормаў, якія даў Алах. Таму тут ёсць такія з'явы, якія для хрысціян могуць здавацца дзіўнымі. Напрыклад, калі чалавек у час посту прапусціў некалькі дзён, ён можа адпасцiцца потым: “О тыя, якія ўверавалі! Пост з’яўляецца для вас такім жа абавязковым прадпісаннем, як і для тых, хто быў да вас. Магчыма, вы будзеце богабаязнымі. Лічанымі днямі з’яўляюцца дні посту. А хто з вас будзе хворы або апынецца ў дарозе, той перанясе пост на іншыя дні. Той жа, хто не зможа папоўніць яго ў іншыя дні (па прычыне старэчай немачы або невылечнай хваробы), павінны накарміць беднага. Хто зробіць больш (чым накарміць беднага), то гэта – лепшае для яго самога. Аднак, калі вы будзеце папаўняць прапушчаныя дні посту, выконваючы яго, то гэта – найлепшае для вас, калі б вы гэта ведалі!” (Каран. 2. 183–184). Для параўнання скажам, што ў хрысціянстве немагчыма, каб веруючы пасціўся пасля Вялікадня, адпрацоўваючы прапушчаныя дні Вялікага посту.

Усё сказанае вышэй ні ў якім разе не азначае, што хрысціянства “лепшае” або “больш маральнае” за іслам. Мы толькі хочам падкрэсліць адрозненне самога характару маралі, якое ёсць у хрысціянстве і ў ісламе. Трэба спыніць увагу і на тым, што тое разуменне адрознення маралі і права, якое нам уласціва, гэта прадукт еўрапейскай культуры, адной з характарыстык якой з’яўляецца хрысціянства. Маральнасць (або амаральнасць) мы разумеем перш за ўсё як выяўленне ўнутранага свету чалавека, яго асабістага выбару. Увага засяроджваецца не на сістэме маральных нормаў, а на чалавеку, які гэтыя нормы выконвае. Адна з асаблівасцей еўрапейскай культуры – адкрыццё свабоднай і актыўнай асобы. Маральныя ўчынкі тут – гэта вынік свабоднага выбару, калі апошняга няма, яны знаходзяцца па-за межамі маралі. Свабода чалавека – гэта адно з фундаментальных палажэнняў хрысціянства ў яго разуменні чалавека: “Да свабоды закліканы вы, браты” (Гал. 5, 13). У аснове хрысціянскай маралі ляжыць не выкананне нормаў, а любоў да блізкага: “І спытаўся адзін з іх, законнік, спакушаючы Яго і кажучы: Настаўнік! Якая запаведзь найбольшая ў законе? Ісус жа сказаў яму: “Палюбі Госпада Бога твайго ўсім сэрцам тваім, і ўсёю душою тваёю, і ўсім разуменнем тваім”; гэта найбольшая і першая запаведзь; а другая падобная да яе: “палюбі блізкага твайго як самога сябе”; на гэтых дзвюх запаведзях грунтуецца ўвесь закон і прарокі” (Мф. 22, 35–40). Пры адсутнасці гэтай любві чалавек перастае быць хрысціянінам, нават калі ён надзвычай странна прытрымліваецца знешніх нормаў паводзін: “Калі я кажу мовамі чалавечымі і анёльскімі, а любві не маю, дык я – медзь звонкая або кімвал гулкі. Калі маю дар прароцтва, і ведаю ўсе таямніцы, і маю ўсякія веды і ўсю веру, так што магу і горы перастаўляць, а не маю любві – дык я нішто. І калі я раздам усю маёмасць маю і аддам цела маё на спальванне, а любві не маю – няма мне ў тым ніякай карысці” (І Кар. 13, 1–3).

Першыя хрысціяне бачылі сваё асноўнае адрозненне ад папярэдняга ім іудаізму менавіта ў тым, што яны апраўданы перад Богам не праз выкананне закону, а праз ахвяру Ісуса Хрыста: “Але сёння, незалежна ад закону, з’явілася праўда Божая, пра якую сведчаць закон і прарокі, праўда божая праз веру ў Ісуса Хрыста ва ўсіх і на ўсіх вернікаў; бо няма розніцы, бо ўсе саграшылі і пазбаўлены славы Божай, атрымліваючы апраўданне дарам, паводле ласкі Ягонай, адкупленнем у Ісусе Хрысце, якога Бог прынёс у ахвяру ўміласціўлення” (Рым. 3, 21-25). Згодна з хрысціянствам, Хрыстос вызваліў людзей з палону грахоў. Быць свабодным – адно з патрабаванняў хрысціянскай маралі: “Да свабоды пакліканы вы,браты” (Гал. 5, 13).

Трэба падкрэсліць, што наяўнасць свабоднага ажыццяўлення – гэта адна з падстаў для

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ацэнкі таго ці іншага ўчынку чалавека з пункту погляду яго маральнасці. Але свабода ў хрысціянстве не зводзіцца да свабоды выбару паміж тымі ці іншымі спосабамі паводзін, яна грунтуеццца на прыняцці пэўнай іерархіі каштоўнасцей. Маральныя нормы разумеюцца не як тое, што абмяжоўвае чалавека, а як тое, што дазваляе яму быць чалавекам. Свабода – гэта не тое, што ператварае чалавека ў эгаіста, які кіруецца ў сваіх учынках уласнымі інтарэсамі. Жывёлы якраз тым і адрозніваюцца ад чалавека, што ў іх няма маральнага выбару, іх паводзіны цалкам вызначаюцца біялагічнымі законамі (інстынктам да самазахавання, інстынктам да працягу роду і г. д.). Чалавек жа сам будуе свае паводзіны ў адпаведнасці з сістэмай маральных нормаў, якая мае імператыўны характар.

У заключнай частцы падкрэслім, што тыя маральныя нормы, якімі мы карыстаемся і якія здаюцца нам відавочнымі і агульначалавечымі, створаны ў межах канкрэтнай, а менавіта – еўрапейскай, культуры, адной з асноў якой з'яўляецца хрысціянства. У аснове маральных сістэм іншых культур ляжаць іншыя рэлігіі, і таму там інакш разумеецца сутнасць і вытокі маральных паводзін. Усё гэта трэба ўлічваць пры спробах наладзіць дыялог паміж прадстаўнікамі розных культур, каб праяўляць павагу да іх маральных поглядаў і не навязваць ім свае.

**Abstract.** The paper presents comparative analysis of the moral systems of three world religions Buddhism, Christianity and Islam. It is concluded that each religion is a specific system of outlooks and actions which are based on a specific idea of supernatural. The religions are not compatible with one another. The regulations of one religion can not be adequately interpreted from the point of view of the others.

Гомельскі дзяржаўны універсітэт
імя Францыска Скарыны
Паступіла 15.12.08

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ